*УДК 398.332.422(476.2-37Гомель)*

**Г. А. Тычына**
***Навук. кір. – А. А. Кастрыца, канд. філал. навук, дацэнт***

# КАЛЯДЫ Ў ГОМЕЛЬСКІМ РАЁНЕ

Артыкул прысвечаны разгляду каляднай традыцыі Гомельскага раёна. Аўтар звяртаецца да найбольш папулярных на тэрыторыі раёна абрадавых дзеянняў і песень, павер'яў і варожбаў, звяртае ўвагу на эк- лектычны характар мясцовага фальклору, гаворыць аб адметных ры- сах святкавання Каляд у Гомельскім раёне і яскрава выражанай агуль- набеларускай традыцыі.

Калядныя святы займаюць важнае месца ў каляндарнай абраднас- ці беларусаў і разглядаюць іх даследчыкі «як свайго роду помнік эт- нічнай гісторыі беларускага народа, як своеасаблівую культурную спадчыну мінулага» [1, с. 15]. Варта заўважыць, што на сённяшні дзень, і аб гэтым дазваляюць гаварыць палявыя фальклорныя экспе- дыцыі па Гомельскім раёне (2006, 2014 гг.), звесткі пра калядныя пес- ні, абрады і звычаі добра захаваліся ў памяці мясцовых жыхароў. Так, ад жыхаркі в. Рудня-Марымонава Маёравай Еўфрасінні Іванаўны, 1934 г. н., быў запісаны тэкст цікавай святочнай песні:

*У канцы сяла да*
*стаіць вярба, Каляда,*
*да ты Калядзіца!*

*Да на той вярбе да*
*дзіка каза. Прыйшоў да*
*яе да сівы ваўчок:*
*– Да злезь, козка, да*
*патанцуйма, Да*
*патанцуйма, да*
*пажартуйма!*
*– Да не палезу, бо цябе баюся:*
*Калі ў цябе, воўча, хвост вялікі.*
*– Я ў караля быў, пакоі*
*замятаў, Пакоі замятаў,*
*хвост размахаў, Каляда,*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*да ты Калядзіца!*

Урачысты настрой, пазітыўныя эмоцыі, сімвалічныя вобразы, увасобленыя ў папярэднім тэксце, характэрны для ўсяго комплексу калядна-навагодніх святкаванняў, з якімі, як вядома, нашы продкі звязвалі свае надзеі на шчаслівае жыццё ў будучым годзе, на багатым ўраджай і дабрабыт сям’і.

У Гомельскім раёне, як сведчыць фактычны матэрыял, было тры куцці: «*Первая – посная, 6 студзеня*. На яе з ячменнага пшана варылі кашу, лажылі на кут сена, ставілі куццю ў сена. ...*Втарая* куцця *бага- тая, 13 студзеня*. На втарую куццю на кут лажылі сена і ставілі на яго куццю. Але ў другую куццю ўжо дабаўлялася масла *Трэцяя* куц-
ця *скаромная, 18 студзеня*. На скаромную куццю былі на стале бліны, мяса, сала, халоднае. Скаромная куцця служыла аканчаннем Каляд» [2, с. 55]; «*Напярэдадні Ражаства* дзень называлі *посная куцця* – Дзяды. У гэты дзень варылі куццю. ...*Другая куцця* называлася *шчод- рая, мясная*. ...*Трэцяя крашчэнская – посная куцця*» [2, с. 64]. Такім чынам, у каляднай традыцыі Гомельскага раёна, варта выдзяляць тры перыяды: уласна Каляды (Ражаство), Новы год і Вадохрышча. Да кожнага з гэтых свят гатавалася абавязковая рытуальная ежа – каша, якая варылася ў адным гаршку і з аднолькавай колькасці круп.

Асаблівасці падрыхтоўкі хаты да свята («*У нас на Каляды всегда ўбіралі хату, бялілі паталок, мылі пол, усё прыбіралі, штоб было чысценька*» [2, с. 89]), спецыфіка гатавання святочнай вячэры, размер- каванне ролей у абрадавых дзеяннях (напрыклад, зварот менавіта гас- падара да мароза: «*Мароз, мароз, хадзі куццю есці! І іржа, і бель, ха- дзіце цяпер! А ўлетку ў нас не бывайце, хлеба нашага не ўбівайце*» (аг. Новая Гута)) і самі абрадавыя дзеянні («*Баба несе з печы гаршчочык із куццёй і кажа: “Ко-ко-ко”, і тая там: “Кудах-дах-дах”*» [2, с. 89]), калядныя варожбы («*Сена з-пад скацеркі цягнулі: у каго длiннейшая саломка, у таго і багаты ўраджай*»; «*Калі дзеўкі спаць клаліся, дык пад падушку грэбень клалі: “Сужаны, ражаны прычышы мяне”*» (в. Рагі); «*На вячорках кладуць дзеўкі грабяшкі ў начоўкі і палаюць, калышаць. Чый грабяшок першы выпадзе, тая пойдзе первая замуж. Тынкі хапалі, дровы ўносілі, лічылі: да пары ці не да пары. Лазілі ў хлеў, карову мацалі: еслі за рогі карову цапаеш – будзе бедна, за сярэ- дзіну – сярэдне, за зад – багата. Бегалі па падаконні, слухалі: еслі ў хаце хто скажа “сядзь” – будзеш сядзець у дзеўках, скажа “ідзі”*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– *выйдзеш замуж*» (в. Новыя Дзятлавічы)), прыкметы і павер’і («*Калі ў першы калядны вечар снег ідзе, дык год ураджайны будзе*», «*Семкі елі, на пол плявалі: чым больш наплявалі, тым больш ураджай будзе*» (в. Рагі)) мясцовых жыхароў даволі гарманічна ўпісваюцца ў агульна- беларускую калядную традыцыю. Праўда, справядлівым будзе адзна- чыць, што для каляндарна-абрадавай творчасці Гомельскага раёна ха- рактэрна тэндэнцыя «ўзбагачэння мясцовых традыцый, дзякуючы пе- расяленцам з іншых вёсак і раёнаў Гомельшчыны» [2, с. 42]: «*На Ка- ляды ў нас дзелалі бусла. Становіцца мужык адзін, здзелаюць бусла, дзюбку пакрасяць, выражуць, у рукавы палкі закладываюць яму, і ён тады плячамі дзвігае, і палкі етыя хлопаюць, як крылья ў бусла. І дзелалі яму хвост з палатна, а патом ета палатно чарнілі: чорная палоска, белая, чорная палоска, белая. І так хадзілі. Еты бусел заходзіў у хату. ...На рэчку хадзілі, масцілі яшчэ кладку чэраз усю рэчку. Наламаюць галля, наложуць, і тады бягуць дамой і ўжэ ні з кім не разгаварваюць. У хату прыбягуць моўчкі, ні з кім ні аднаго ні слова і лягуць спаць. Які хлопец сасніцца, за тога дзеўка замуж пойдзе*» (запісана ў в. Рудня-Марымонава ад перасяленкі з в. Халочча Чачэрскага р-на Драбышэўскай Соф’і Трыфанаўны, 1939 г. н.).

Па словах даследчыка фальклорна-этнаграфічнай спадчыны Го- мельшчыны В. С. Новак, «важны абрадавы момант калядна-навагод- няга комплексу Гомельскага раёна – абходныя шэсці калядоўшчыкаў, якія ў залежнасці ад канкрэтнай мясцовай традыцыі былі звязаны з рознымі днямі святкавання куцці. Звычайна цырымонія калядавання была прымеркавана ў вёсках Гомельскага раёна да другой куцці» [2, с. 43]. Напрыклад, «*казу дзелалі, хадзілі па хатах песні пелі*» (в. Шарпілаўка), «*звязвалі какіе-небудзь, красівыя платкі, выварачвалі кажух. Жэншчыні ішлі калядаваць*» (в. Чкалава), «*проста ўсе чысценька адзяваліся, дзеўкі всегда адзявалі красівыя платкі з махра- мі. Хадзілі ўсе па хатах, стучалі ў акно і песні пелі»* (в. Урыцкае), «*у гэты дзень дзеці сабіралі сумкі і хадзілі шчадраваць па хатах вечарам і прыгаворвалі такія словы: "Шчадрую, шчадрую, каўбасу чую". "Дайце сала, каўбасу я дамоў прынясу"*» (аг. Новая Гута), «*збіраліся раней групкай дзеўкі, хлопцы, бывала, што і ў цыган апраналіся, а маглі і так проста прыгожыя адзежы надзець. Хадзілі ды за вокнамі песні пелі.* Маладыя звычайна пелі: *Шчадруем, шчадруем, Каўбаску чуем.*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Адкрывайце*
*сундучкі,*
*Даставайце*
*пятачкі,*
*Пятачкоў*
*нету –*
*Давайце*
*канфету.*
*Канфеты нету –*
*Давайце манету*
(в. Рагі).

Калядоўшчыкаў абавязкова адорвалі, бо верылі, што яны прыно- сяць з сабой дабрабыт у дом і шчасце ў сям'ю: «Давалі не толькі цу- керкі, дзеньгі ў аснаўном давалі ўсегда, счыталася ў дзерэўне, што на- да, штоб абязацельна. Зашчадравалі хлеб і его, этат хлеб, давалі ўсегда жывотным. ...Зашчадраваны шчытался такой вот как будта цэ- лебны, што людзі яго далі з дарагой душой, з дабратой і яго нада абя- зацельна даць жывёле» [2, с. 93].

Інфарматары расказвалі, што калі ім за песні не давалі пачастун- каў, то яны маглі адпомсціць нядобрымі пажаданнямі:

*Штоб табе,*
*дзядначка, Пад*
*вакном ямачка,*
*Штоб ты*
*ўвалілася, Ды*
*ўтапілася* (в.
Рагі).

Увогуле ж, паўсюдна на тэрыторыі Гомельскага раёна гаспадарам на Каляды жадалі шчасця, здароўя, дабрабыту.

Узгадваюць інфарматары і пра гулянні моладзі: «*Моладзь найма- ла хату. Сюды адносіліся маладыя дзяўчаты. Наймалі музыкантаў (гарманіста), танцавалі два дня. Гэты біў у бубен і за гэта трэбаваў арэхі. Гарманісту плацілі грошы, а арэхі азначалі шчадроўкі і дзеўкі далжны хлапцоў угашчаць*» (аг. Новая Гута).

Прыведзеныя вышэй прыклады сведчаць як аб адметных рысах мясцовага святкавання Каляд, так і аб яскрава выражанай агульнабе- ларускай традыцыі.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Спіс літаратуры

1 Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / Уклад., класіфікацыя, сістэ- матызацыя матэрыялаў і камент. А.І. Гурскага; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса. – Мн.: Бел. навука, 2003. – 429 с.

2 Народная духоўная спадчына Гомельскага раёна / Укладанне, сістэматызацыя, тэксталагічная праца і рэдагаванне В. С. Новак. – Гомель: ААТ “ Полеспечать”, 2007. – 456 с.

* Выкарыстаны матэрыял фальклорнага архіва кафедры беларускай культуры і фальклiарыстыкі УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны»

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ